Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Сын Беларуса

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12, п. 6.** (Wileńska 12 m. 6). Рэдакцыя адчынена ад **12** да **2** г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад **9** да **3** г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на **адзін месяц** з дастаўкай да хаты **2 злотыя**
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі. Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 грош., за радок пэтыту у 1 шп.

№ 34. Вільня, Нядзеля, 31-га жніўня 1924 г. Год I.

Будуйма усе разам!

Той магутны народны рух, які на нашых вачох творыць беларускую нацыянальную культуру, выплывае з захаванае ў жывой масе народу нявычарпанае крыніцы творчых сіл.

Сучасная беларуская культура ў аснове сваей і зьяўляецца адбіцьцём душы нашых працоўных масаў. Але — побач з сучаснасьцяй—кладзе на ёй свой сьлед і мінуўшчына, спадчына культурнае творчае працы мінулых пакаленьняў, калі народ беларускі жыў незалежным і поўным дзяржаўным і нацыянальным жыцьцём. І той факт, што мы ўжо раз прайшлі дарогу да вытварэньня ўласнае культуры, дае нам вялікую палёгку пры будаваньні новае беларускае культуры.

Вось, чаму мы павінны з асаблівай уважлівасьцяй аднасіцца да творчасьці нашых прапрадзедаў і рупліва зьбіраць і зьберагаць памяткі нашае старасьвеччыны. Вось, чаму 400-гадовы юбілей закладзін першае ў Вільні друкарні—да таго-ж друкарні беларускай—вялікім беларускім гуманістам, доктарам Францішкам Скарынай, зьяўляецца агульнанацыянальным беларускім сьвятам і будзе ўрачыста сьвяткавацца як у Заходняй Беларусі, так і ў Усходняй—Радавай Беларусі, дый за межамі нашае Бацькаўшчыны, дзе толькі ёсьць беларусы.

Беларускае Навуковае Таварыства ў Вільні пастанавіла асабліва адзначыць 400-тыя ўгодкі пачатку беларускага друку ў сталіцы Беларускага-Літоўскага гаспадарства ў будучым 1925 годзе: яно маніцца ўладзіць у Вільні *выстаўку беларускае кнігі*—пачынаючы ад найдаўнейшых часоў і канчаючы бягучым мамэнтам.

Гэту пастанову трэба горача прывітаць: выстаўка беларускае кнігі—гэта разам з тым і прагляд гісторыі нашае старое культуры, старога Рэнэсансу, і абраз сучаснае адраджэнскае працы, новага Рэнэсансу. І трэба, каб у гэтай важнай справе на пачынаньне Беларускага Навуковага Т-ва адгукнуліся ўсе беларусы, каб кожын, хто можа, прылажыў сваю руку да ўладжаньня выстаўкі беларускага друку.

І напэўна ёсьць шмат больш, чым мо' каму здаецца, такіх людзей, якія зусім лёгка могуць аказаць у гэтай важнай справе вялікую дапамогу. Сколькі гэта старых беларускіх пісаных і друкаваных у Вільні, Супрасьлі, Еўі, Нясьвіжы, Горадні, Магілёве і іншых чысьленых беларускіх друкарнях кніг і кніжачак валяецца на падстрэшшах старых дамоў і асабліва цэркваў ды каплічак, па плябаніях, на званіцах і г. п.! І ўсё гэта гніе, трухлее і разваліваецца, або зьядаецца мышамі, ды гэтак гіне наша старая культурная спадчына!

Усё гэта трэба ратаваць. Няхай кожын, каму нешта такое пападзецца на вочы, цягне старыя кнігі і рукапісы, хоць і падзертыя, хоць і кускі іх ці асобныя страніцы, няхай шлець у Вільню ў нашае Навуковае Таварыства, — і там гэта будзе разгледжана, ачышчана, скамплектавана, ды мо' выкрыецца не адна цэнная праца нашых дзядоў, аб якой ня ведае ніводная бібліяграфія! Няхай пры гэтай нагодзе кожын пастараецца знайсьці і зьберагчы ды таксама аддаць у наш нацыянальны музэй кожную старую памятку нашага, ці то абразок, ікону, фігурку старую, ці тканіну, аружжа, манэты і інш. Усё гэта ўзбагаціць музэй, створаны ахвярнай працай усяго жыцьця с. п. Івана Луцкевіча.

Асабліва выдатную помач у гэтай справе могуць аказаць усе тыя, хто зьвязаны з царквой: сьвяшчэньнікі, царкоўная служба і інш.

Гэтак бачым, што ў ладжаньні выстаўкі беларускае кнігі і музэю могуць запраўды прыняць чыннае ўчасьце бадай усе беларусы: хто—ахвярай грошы, а хто — старасьвецкіх рэчаў, кніг, дакумэнтаў і т. п. І чым больш людзей будзе рупіцца аб гэта, тым лепш і паўней удасцца ушанаваць памяць нашага першага друкара ў 400-тыя ўгодкі пачатку яго друкарскае працы ў Вільні.

Рэчы для выстаўкі і музэю можна пасылаць на рукі сябраў ураду Беларускага Навуковага Т-ва ў Вільні, а іменна:

1) Антона Луцкевіча (старшыні) — *Вільня, Віленская вул. 8, кв. 3.*

2) Пасла Браніслава Тарашкевіча (сэкрэтара)—*Вільня, Віленская вул. 12, кв. 7-а.*

3) Антона Трэпкі (скарбніка) — *Вільня, ул. Рыдза Сьміглага (б. Арэнбурская) 35.*

4) Пасла кс. Адама Станкевіча - *Вільня, Касьцёл сьв. Мікалая.*

5) Пасла Сымона Рака-Міхайлоўскага — *Вільня, Вострабрамская 7.*

Жыцьцё вучыць.

Калі ўсе дзяржавы Эўропы дзесяць гадоў таму назад рыхтаваліся да братабойчае вайны, толькі адзін Жорэс ува ўсім сацыялістычным сьвеце адважыўся падняць голас пратэсту проці вайны. І за тое, што Жорэс хацеў перашкодзіць вайне, заклікаючы работніцкія масы на дзеле выявіць *салідарнасьць пралетарыяту ўсіх краёў і народаў*,—ён быў забіты рукой найміта францускіх капіталістаў...

Прайшло з таго часу дзесяць гадоу. І вось тыя самыя францускія, англійскія і нямецкія работнікі, якія тады асталіся глухімі на голас Жорэса і ў нацыяналістычным захапленьні йшлі забіваць адны адных дзеля карысьці сваіх капіталістаў, угледзіўшы сваімі вачыма ўсе страшэнствы вайны і спазнаўшы на сабе горкія плады яе—нават для народаў-пераможцаў, пачынаюць ужо другімі вачыма ўглядацца на пытаньне аб зьдзейсьненьні агульнасацыялістычнага кліча: *работнікі ўсіх краёў злучайцеся.*

Вынікам гэтага і зьяўляецца той новы курс, які—пад націскам сваіх працоўных масаў—узялі новыя ўрады Францыі і Англіі ў адносінах да Нямеччыны.

Але ня толькі ў справах міжынародавых адносінаў выяўляецца прасьвятленьне работніцкіх масаў Эўропы. Той вялізарны, бязпрыкладны эканамічны крызіс, які запанаваў па ўсей Эўропе, як вынік імпэрыялістычнае палітыкі дзяржаваў-пераможцаў, давёў да таго, што капіталісты пачалі касаваць сацыяльныя заваяваньні працоўных масаў. Першая зрабіла гэта Нямеччына, якая замест 8-гадзіннага завяла 10-гадзінны дзень працы для сваіх работнікаў, каб іх мазалём сплачываць кантрыбуцыю, узложаную на Нямеччыну за грахі яе капіталістаў. Сьледам за ёй пайшла Польшча, якая знаходзіцца ў вялізарнай эканамічнай залежнасьці ад Нямеччыны. А ў сувязі з праектаванай гаспадарчай санацыяй Нямеччыны могуць аказацца прымушанымі зрабіць тое-ж і яе канкурэнты—перад усім Францыя і Англія...

І вось ужо не *адарваная ідэя* пралетарскае салідарнасьці, а пачуцьцё асабістае небясьпекі на грунце ўтраты нямецкімі работнікамі аднаго з найважнейшых работніцкіх заваяваньняў наагул прымусіла работнікаў антанцкіх гаспадарств прыпомніць запаведзі пагібшага сваёго праваднра Жорэса і на дзеле пераканацца, сколькі *рэальнага значэньня* крыецца ў ідэі супольнасьці інтарэсаў працоўных. Пад націскам сваіх работнікаў, прадстаўнікі антанцкіх урадаў у Жэневе пастанавілі ўжо *патрэбаваць* ад Нямеччыны, каб ізноў вярнула 8-гадзінны рабочы дзень.

Вось яна—супольнасьць інтарэсаў пралетарыяту! Самы ход жыцьця стаўляе яе ўваччу ўсім работнікам усіх краёў і ўсіх народаў. А калі яна так бязспрэчна істнуе у работнікаў *розных* дзяржаў, дык і пагатоў таго ў межах *аднае* дзяржавы.

Хай аб гэтым добра памятаюць і работнікі рознаплеменнай Польшчы, хай з гэтага жыцьцёвага павучэньня зробяць *належныя вывады*!

К. Фалькевіч.

Трагічная пагроза сьмерці.

Месяц таму назад у газэтах няпрыкметна нейк з правінцыі прамільгнула заметка, што ў Слоніме ў ноч з 20 на 21 ліпня выкрыты быў няўдаўшыся пабег каля 20 палітычных вязьняў на чале з дазорцам гэтае-ж турмы, нейкім Курылам.

Пазнаёміўшыся прыпадкова больш дэтальна з абставінамі гэтае незразумела-прыкрае, а разам і сумна-трагічнае справы, прыпамінаюцца з далёкае мінуўшчыны падобныя палітычныя працэсы, якія траплялі—толькі не на каронны ды яшчэ „даразны“, а на грамадзянскі суд—суд прысяжных!

Калі-б падобныя справы вырашаліся і ў сучасны мамэнт шляхам сумленнае грамадзянскае развагі, то, бязумоўна, такія судзьдзі, перш, чым сказаць сваё апошняе слова, павінны-б былі вырашыць наступныя пытаньні:

1. Ці гэта—безглузднае й нічым ня вытлумачанае дуронства?

2. Ці то—нейкая незразумелая трагедыя?

3. Ці можа тут і глыбей „сабака зарыта“ — так глыбака, як часта здольна на гэта правакацыя?

А вырашыць гэтыя пытаньні пры сучасных абставінах, калі на лаве падсудзімых—і бяз гэтага, відаць, „вінаватыя“, бо ўжо сядзелі (можа хіба ня так моцна), а сьведкі—выключна пашкадаваныя,— надта цяжка.

Малюнак заблутана-незразумелы ды бязглуздна-трагічны:

Вязьні ў лічбе больш 20 у 1 гадз. ўначы выпушчаны (ці самі вышлі) з камэраў на вастрожны падворак. Цёмна, ціха, глуха! Усе ключы ад брамаў у іх; нават драбіна тут прыстаўлена да вастрожнага муру, адкуль дарога туды.... у прастор... на волю!

На падворку адзін толькі безаружны вартаўнік, якога яны „душаць“ амаль што не ў пяцёх... „душаць“ рукамі, „душаць“ спэцыяльна дзеля гэтага прыгатаванымі ручнікамі, ды яшчэ нейкімі прыладамі. Нарэшце гатова! ужо задушылі — ляжыць няпрытомны, а на падворку нікога няма, апроч тых, хто вышаў і рвецца на волю...

Пара! усё скончана! І яны бягуць ..... бягуць назад у турму.... на знаёмыя, так, відаць, прыемныя для іх, нары!..

Разам з імі бяжыць на нары й той, хто ім даў магчымасьць уцякаць, — бяжыць Курыла! А сьледам за імі бяжыць ужо й задушаны, бягуць яшчэ два дазорцы, бяжыць і сам начальнік...

І ніхто нічога тут ня ўцяміць! Бо й нельга тут уцяміць, як відаць, розумам, а толькі... сэрцам!..

Трагедыя, вынікам якое, відаць, будзе сьмерць!

Сьмерць вінных ці нявінных?!

На гэта адкажа час, але... позна!

Магіла.

Крыху халоднай вады.

З прычыны таго, што некатарыя „спэцы“, заахвочаныя „зьвінячым“ падмацункам, стараюцца шырыць сярод нашага народу веру ў нейкі „новы курс“ у адносінах польскае ўлады да нацыянальных „меншасьцяў“, у тым ліку й да беларусаў, — падаем тут цікавую пробку гэтага „новага курсу“ ў адносінах да братняга нам украінскага насяленьня.

Як ведама, польскі ўрад, пасьля прызнаньня радай амбасадораў усходніх граніц Польшчы, легалізаваўшага фактычнае валаданьне яе Галічынай, абязаўся

перад Лігай Народаў даць гэтай краіне поўную палітычную аўтаномію, а пакуль яна будзе праведзена — забясьпечыць аўтаномію культурную і даць украінскую вышэйшую школу.

Што Польшча дала Галічыне замест аўтаноміі, мы ведаем...

А вось цяпер украінская часопісь „Діло“ піша, як польскі ўрад выпаўняе і гэтую меншую абяцанку, рыхтуючыся да надыйшоўшай ужо сэсіі Лігі Народаў, на якой новы міністар загр. спраў п. Скшыньскі мае давясьці „ляяльнасьць выпаўненьня Польшчай яе абязацельстваў“.

„У Кракаве—піша „Діло“—польскі ўрад пастанавіў адчыніць нейкую школку ў Кракаўскім Унівэрсытэце, — пад галосным назовам „Украінскага Унівэрсытэту“... Зразумела, што гэткі „Унівэрсытэт“ можа мець толькі „палітычнае“ значэньне, справядлівей — будзе толькі „дыплёматычнай“ прыладай у руках пана Скшыньскага, каб баламуціць даверые Лігі Народаў. Нашых прафэсароў там ня будзе. Украінскі народ абойдзецца бяз гэткай ласкі і знойдзе сваі способы вучыць сваю моладзь, не паніжаючы роўня навукі... Ці будзе адчынена гэтая „вышэйшая школа“, і ці адыграе яна тую „ролю“, якую ёй назначыў п. Скшыньскі, гэта для нас — усё роўна. Думка гэтая — лішне дзяцінная, каб не сказаць мацней, і нікога не абаламуціць“.

Можна спадзявацца, што гэткі самы „беларускі унівэрсытэт у Польшы“ даручыць хутка польская ўлада зрабіць ...віленскаму „Грамадзянскаму Сабраньню“.

На „Усходніх Крэсах“ Грэцыі.

(*Балканскі куток „Вэрсалькай Эўропы“*).

Як ведама, вэрсальскія пераможцы вельмі сурова пакаралі баўгарскі народ за грахі пасаджанага на ягоны карк імі-ж самімі ў суполцы з Нямеччынай караля. За пакорнасьць свайму „законнаму“ каралю баўгарскі народ быў пазбаўлены часьці сваіх зямель з чыста баўгарскім насяленьнем, якія аддадзены адвечным ворагам баўгарскага народу—сэрбам, румынам і грэкам. Апошнія-ж зрабілі гэтак на сусьветнай вайне вельмі добры інтэрас!..

Баўгарскі народ, апрача гэтага, быў эканамічна і фінансава задушаны, папаўшы ў няволю—„ўзброенаму ліхвяру“, гэта значыць дзяржавам-пераможцам у сусьветнай вайне. Агентамі гэтага ліхвяра—вартаўнікамі над баўгарскім народам былі зроблены гэтыя самыя адвечныя ворагі Баўгарыі, якім—на зьдзек і самаволю—аддадзены баўгарскі народ.

Калі „найкультурнейшы“ пан Пуанкарэ ў самым цэнтры культурнай Эўропы гэткімі дзікімі способамі рабаваў і забіваў ужо пабітае і паняволенае нямецкае насяленьне ў „Рурскім вастрозе“, дык можна сабе прадставіць, што—па прыкладу „Вэрсальскіх багоў“—рабілася ў балканскай—сэрба-грэка-румынскай паліцэйскай жывадзёрні, якую стварыў для баўгарскага народу Трактат у Нэйі. (Neuilly).

І вось,—толькі цяпер, калі на ўласнай кішані вэрсальскія пераможцы пераканаліся аб зусім нявыгаднай для іх эканамічна, хоць гэтак прыемнай для іх „амбіцыі“, перамозе, якую трэба падтрымліваць усьцяж павялічываючы выдаткі на войска; калі пачаўся магутны нацiск на антанцкія ўрады з боку разбуджаных работніцкіх масаў, ды адначасна ўзьнялася *пагроза паўстаньня ўсяго падбітага і паняволенага імі вялізарнага масыву „ніжэйшых“ расаў*,—толькі ў апошнія часы дзяржавы-пераможцы пачалі зварачаць увагу і на пераможаных, — а паміж тым і — на тое, што робіцца і ў балканскім „засьценку“. Трэба аднак-жа і тут сьцьвердзіць, што зьвярнулі ўвагу толькі тады, калі зусім ужо, здавалася, падбіты і „дыхаўшы на ладан“ баўгарскі сялянскі народ—*раптам пачуў сваю сілу, атрымаўшы дапамогу з Усходу*... І вось Антанта пачала канкураваць у „вя-ікадушнасьці“ з С.С.Р.Р.

Мы толькі што чыталі аб тым, што на Балканах можа выбухнуць новы пажар, які можа запаліць, як і 10 гадоў таму назад, увесь сьвет. Чыталі, што на „мабілізацыю“ (?) у Баўгарыі адказалі рашучымі ваеннымі мерамі яе антанцкія турэмшчыкі — Югаславія, Грэцыя і Румынія. Чыталі перад тым і аб повадзе ўсей гэтай суматохі...

І вось цяпер толькі-што разабрала адзін з гэных повадаў міжнародавая камісія, дык можам пазнаёміцца крыху бліжэй і на канкрэтным прыкладзе—з тым, якія адносіны запраўды стварыліся ў балканскім кутку „Вэрсальскай Эўропы“,—гэтак падобным да нашага...

Грэцыя абвінавачывала ўвесь час Баўгарыю ў тым, што баўгарскія ўзброеныя „дывэрсыйныя банды“ ўрываюцца на грэцкую тэрыторыю і пастаянна робяць замахі, руйнуюць урадовыя установы, забіваюць мірнае насяленьне і—грэцкіх урадоўцаў ды жаўнераў. Што аддадзенае Грэцыі ў пагранічных абшарах баўгарскае насяленьне „чынна памагае бандытам“.

Апошні выпадак, на які грэцкі ўрад рэагаваў гэтак востра, меў месца ў ваколіцах Тарлісу 16 жніўня.

Камісія сьцьвердзіла, што запраўды ў групу сядзеўшых над ракой грэцкіх вайсковых, паміж якімі былі ня толькі грэкі цывілі, *але і шмат баўгараў*, былі зроблены з за ракі некалькі стрэлаў і кінуты ручныя гранаты. Пры гэтым прыпадкам не пацярпеў ніхто.

Тады *ваенна-паліцэйскія* ўлады пачалі сваю „работу“. Камандант пагранічнага батальёну, рашыўшы, што гэта „работа дывэрсыйных бандаў“, называных тамака—„камітаджамі“, пачаў арышты ў 3 суседніх мясцовасьцях, якія ён асабіста палічыў „падазронымі“...

Заарыштаваўшы каля 60 баўгараў, ён частку іх выслаў пад эскортам 10 жаўнераў з *ахвіцэрам* да бліжэйшай турмы. Гэты ахвіцэр,—што вельмі цікава, толькі 3 месяцы назад пастуліў у грэцкае войска, а перад тым „працаваў“, як павадыр у... гэткай самай „дывэрсыйнай бандзе“, якую цяпер стаў лавіць на тых-жа „крэсах“...

Усе арыштаваныя сяляне былі скаваны па-парна і пагнаны ўмысна праз горы, а ня звычайнай дарогай, ды такой *вузкай сьцежкай*, на якой, як сьцьвердзіла камісія, *ледзь можа прайсьці адзін чалавек*. Вярнуўшыся хутка назад, „ахвіцэр“ заявіў, што „бандыты“ зрабілі спробу ўцячы, дык прыйшлося частку іх забіць, а частка ўцякла... Камісія сьцьвердзіла, што *ўсё гэта няпраўда: што закаваныя сяляне былі папросту застрэлены і скінуты з абрыву*, што з іх боку ня было ніякага нават поваду да гэтага!

Камісія апроч таго сьцьвердзіла, што „*баўгарская меншасьць* жывець на грэцкім пагранічным абшары *пад сталым страхам за сваё жыцьцё і маемасьць* і ад гэтага тэрору масамі ўцякаець за кардон...

Вось, як пачынае вылазіць *праўда аб меншасьцях*, як толькі выкрываць яе едуць *не сваі* паны „Тугутты“, але асобы незаінтарасаваныя... В.

Інтэрпэляцыі Беларускага Пасольскага Клюбу.

ІНТЭРПЭЛЯЦЫЯ

паслоў з Беларускага Клюбу да п. Міністра зямельных рэформаў у справе **несправядліва накладзеных** на жыхараў вёскі Дубатоўкі, Жодзішскае гміны, Сьвянцянскага павету, **камасацыйных коштаў**.

Ніжэй падаецца зьмест заявы, якую прыслалі ў Беларускі Пасольскі Клюб жыхары вёскі Дубатоўкі, Жодзішскае гміны, Сьвянцянскага павету:

„У 1921 годзе не даваў нам спакою п. Земскі Камісар Рэксьць, які шмат разоў зьяўляўся ў нашую вёску ды намаўляў, каб мы зрабілі камасацыю сваей зямлі з мэтай пераходу цалком на новае пасяленьне. Спачатку мы не паддаваліся яго намовам, але ён запэўніў нас, што ўсе выдаткі па правядзеньню камасацыі будуць прыняты ўрадам на сябе, тым балей, што ўрад клапоціцца аб тых земляробах, якія пяройдуць на хутары, і нават будзе ім дапамагаць матар'яльна, каб палепшыць іх гаспадаркі, і нашая вёска не панясе ніякіх камасацыйных коштаў ні цяпер, ні ў будучыні. Аб тым-жа, што п. Камісар Рэксьць прапанаваў, што правядзеньне камасацыі нашае зямлі будзе зроблена на дзяржаўны кошт, апроч нас, могуць пасьведчыць каля 500 асоб, жыхараў з вёсак Расла, Казянят, Мартышак, Забалаця, Авечак і Гарыдзянят, у якіх вёсках ён так сама вельмі часта бываў ды намаўляў жыхараў на камасацыю, якую ўрад дзеля дабрабыту сваіх грамадзян робіць дарма. Урэшце мы, жыхары вёскі Дубатоўкі, паддаліся на намовы п. Камісара Рэксьця і згодзіліся перайсьці на хутары, але з умовай, што на час камасацыйных работ вёска нашая дасьць зямлямерам кватэру, будзе іх сталаваць, дасьць патрэбную колькасьць фурманак і работнікаў, рэшту-ж выдаткаў грашовых бярэць на сябе ўрад. Дзеля гэтага быў зроблены пратакол, які нам толькі чыталі, але самі мы чытаць яго не маглі, а калі-б і маглі перачытаць, дык мала што маглі-б зразумець, бо ў той час яшчэ польская мова мала была нам знаёма.

Калі, скончыўшы камасацыю, паехалі ад нас зямлямеры, а мы перайшлі на хутары, дык нам здавалася, што на гэтым усё і канчаецца, і былі мы з таго здаволены, бачучы, што запраўды ўрад імкнецца, каб палепшыць нашую гаспадарку, а калі наведаўся да нас сьв. памяці Прэзыдэнт Нарутовіч, дык ён нават казаў: „шчасьлівыя вы, што ўжо перайшлі на хутары, вам будзе лепш жыць, бо і ўрад будзе вам яшчэ дапамагаць“. Тым часам ўрад нам ня толькі не дапамагае, а йшчэ з нас цягнець.

Усё гэта йшло добра і было спакойна да 1924 году; раптам у месяцы студзені бягучага 1924 году атрымліваем мы ведамасьць на ўсіх гаспадароў вёскі Дубатоўкі, паводле якой павінны заплаціць 1435,38 польскіх злотых за камасацыйную працу, зробленую Віленскім Акружным Земскім Упраўленьнем, і гэта—толькі 40% усяе належачае сумы. Само сабой, што мы цяпер зразумелі, што нас ашукалі і пратакол нам прачыталі ня так, як у ім было напісана; бо, калі-б было напісана, ды так і прачытана, што ня ўрад, а [illegible]

Гістарычныя паралелі.

Як вядома, польская школьная ўлада на „крэсах“, з самага пачатку існаваньня тутака, выдаючы канцэсіі на беларускія і расейскія сярэднія школы, трэбавала выкінуць з ужытку расейскія падручнікі гісторыі і геаграфіі, бо яны былі напісаны тэндэнцыйна, каб выклікаць ненавісьць да польскага народу. Мы так і паверылі на слова, што ўсё, што пісалася ў расейскіх падручніках гісторыі аб адносінах паміж расейцамі і палякамі, ёсьць няпраўда.

Але вось прайшлі ўсяго 4 гады, і мы практычна, на дзеле перажылі нанова гісторыю нашага краю з астатніх 2—3 сталецьцяў. Мы ўбачылі, што адносіны да праваслаўных жыхараў гэтага краю былі якраз такія, як яны апісаны ў забароненых гісторыях, бо тое, што робіцца з праваслаўнымі цяпер у дэмакратычным 20 веку, тым больш пэўна рабілася з імі і ў часы польскага фэодалізму і клерыкалізму.

Цікава параўнаваць факты.

1. Злучыўшы Літву з Польшчаю, польская ўлада пастаралася адарваць праваслаўную царкву ад агульна-рускай царквы і намінальна паддаць яе пад уладу канстантынопальскага патрыарха, турэцкага нявольніка, які ня мог мець па гэтай прычыне і па прычыне далечыні фактычнага ўплыву на царкву. Дзякуючы гэтаму, былі пастаўлены ўладаю такія япіскапы, якія, як Пацей і Тарлецкі, лёгка згадзіліся на вунію.—Цяпер таксама ставяцца на чале царквы ўгодныя ўладзе япіскапы, а ўсе іншыя выкідаюцца. Цяпер таксама бяз згоды і благаславенства агульна-рускай царквы пры помачы аднаго з бычшых канстантынопальскіх патрыархаў адарвана царква праваслаўная ў Польшчы, і на чале яе ставяцца такія людзі, процi якіх паўстае само праваслаўнае духавенства за крыўду царквы.

2. Вунія ўводзіцца прымусам. Ад праваслаўных адбіралі цэрквы і забаранялі ім маліцца. Досыць успомніць пра Іозафата Кунцэвіча, які выклікаў да сябе такую ненавісьць, што быў забіты праваслаўнымі. Цяпер таксама адбіраюцца цэрквы ня толькі тыя, што былі касьцёламі, але і уніяцкія, ня гледзячы на тое, што народ, запраўдны іх уласьнік, не пераходзіць на вунію.

3. Зьніштажэньне вуніі ў 1839 і 1875 годзе было зроблена, як рэпрэсія за 1-ае і 2-е паўстаньне. Гэтым жа было выклікана і адбіраньне і замыканьне касьцёлаў. Але чым выклікана адбіраньне цэркваў у праваслаўных цяпер? Ці можа гэта падзяка ім за тое, што яны, бяручы удзел у сусьветнай вайне, значна прычыніліся да незалежнасьці Польшчы?

4. Польскія гісторыкі хваляцца, што палякі ваявалі заўсёды за „нашу і вашу вольнасьць“ і з другімі народамі дзяржавы абходзіліся, як „вольны з вольным і роўны з роўным“, ды нікога не асымілявалі. Але куды-ж дзелася высокая культура Літоўска-Беларускага гаспадарства, чаму загінуў язык, у якім са і каралі давалі граматы грамадзянам нашага краю? Праўда, тут мы маемо паралелі ў гісторыі другіх народаў. Тое самае зрабілі немцы з культураю чэскаю, туркі з баўгарскаю і сэрбскаю, а англійцы з ірляндзкаю. Ці можна спадзявацца на іншыя адносіны да нашай зусім маладой культуры цяпер?

5. Але вось факт, які ня мае сабе роўнага ў гісторыі жадных часоў і народаў.

Які народ раскідаў на сваей зямлі чужую бажніцу, як гэта робіцца з саборам на Саскім пляцу ў Варшаве? Навет туркі не разбурылі храму Сафіі, а зямянілі яго на мячэць...

6. Вучні езуіцкіх школ калісь нападалі на цэрквы, білі шыбы і сьвяшчэнікаў. І цяпер мы ведаем факты, калі вучні гімназіі білі і лічылі [illegible] варон, а сьвяшчэнік, ня маючы абыватэ[illegible], навет ня даў знаць аб гэтым праваслаўным пасолом. Было гэта ў Бельскім павеце!.. Праваслаўных вучняў гімназіі змушаюць браць удзел у рэлігійных працэсіях на Божае Цела і др. сьвяты. Навет інтэлігентныя польскія сем'і, бяручы да сябе праваслаўную слугу, пераводзяць яе ў каталіцтва, як гэта мела мейсца ў сям'і аднаго дырэктара гімназіі з праваслаўнаю нянькаю няпоўных гадоў...

7. Як ведама, на наш народ глядзелі, як на „быдла“. Гэтыя адносіны асталіся і цяпер, што мы бачым хоць бы ў способе правядзеньня законаў аб мове. Калі гаспадар хоча зрабіць што-небудзь добрае парабку, то ён пытаецца ў яго, чаго-б той хацеў, бо можа тое, што гаспадар даў бы сваім адумам, было-б парабку не саўсім пажаданым. Аб гэтым ня пытаюцца і не гавораць толькі... з быдлам, а даюць яму тое, што гаспадар прызнае добрым!

8. З гісторыі ведаем, што ў польскія часы прыходаў у праваслаўных было так мала, што народ радзіўся, жаніўся і ўміраў без абрадаў, што, калі дзе былі цэрквы, то ключы ад іх былі ў руках арандатараў-жыдоў. Цяпер лічба цэркваў зьмяншаецца настолькі, што можа дайсьці да таго, што рэлігійныя патрэбы праваслаўных ня будуць здаволены. Ключы ад цэркваў таксама ў руках... ня жыдоў, а старастаў!

9. Пасьля Люблінскай вуніі перасталі прыймаць праваслаўных на ўрадовую службу. І цяпер амаль ня ўсе праваслаўныя, каторым мала нават асталося служыць да пэнсіі, выкінуты са службы і зусім ня прымаюцца на яе...

Можа і добра зроблена, што расейскія падручнікі гісторыі выкінуты з школаў, бо на што-ж вучням вучыцца таго, што яны і так бачаць у будзенным жыцьці?! Б.

шая вёска абязываецца выплаціць усе камасацыйныя кошты, дык на такіх варунках мы не згадзіліся-б падпісаць такі пратакол і ўскласьці сабе на шыю пятлю, знаходзячыся ў такой беднаце ды бядзе. Апыніўшыся ў бязвыхадным палажэньні, вырашылі мы зьвярнуцца да Віленскага Акружнага Земскага Упраўленьня, просячы, каб звольнілі нас ад наложаных коштаў за камасацыйныя працы, матывуючы сваю просьбу тым, што мы бедныя і ня маем з чаго плаціць; адначасна паслалі мы ў Вільню чалавека, каб ён там на месцы даведаўся, як стаіць нашая справа, дзеля таго, што мы не абязываліся выплачываць усе выдаткі на камасацыю, бо нам казалі, што камасацыя робіцца на дзяржаўны кошт, — і прасілі мы выдаць нам копію з нашага першага пратаколу, г. ё. ад 29 чэрвеня 1921 году, на падставе якога рабілася камасацыя, ды ў якім не магло быць сказана, каб вёска Дубатоўка абязалася сама пакрыць усе выдаткі на камасацыю. Копіі з таго пратаколу нам не далі, і мы яшчэ больш пераканаліся, што нас ашукалі. Калі б мы былі заможнымі і ня зьнішчанымі вайной, дык дзеля сьвятога спакою якнебудзь заплацілі-б, але, зьбяднеўшы, знаходзячыся ў бядзе, у той час, як ня маем яшчэ будынкаў і ня маем за што іх паставіць, а некаторыя жывуць у акопах,—калі маем мала гаспадарчае жывёлы, калі поле ў акопах і дроце, бо праз нашую вёску праходзіў самы фронт; калі ў шмат каго няма куска хлеба,—дык выплаціць такую вялікую суму не здалеем ніякім чынам.

Дзеля вышэй апісанага зварачаемся да вас, Паны Паслы, з просьбай: зрабеце ласку, заапякуйцеся нашым лёсам і выстарайцеся, каб цалком зьнялі з нас несправядліва накладзеныя камасацыйныя кошты, якіх мы не абязаліся плаціць, бо інакш мы загінем, калі Урад будзе пад прымусам сьцягіваць з нас накладзеныя камасацыйныя кошты.

Як мы ўжо зазначылі, мы—вельмі бедныя, і праз нашую вёску праходзіў фронт, уся вёска зруйнавана ў попел, а самі мы былі выгнаны на шмат гадоў вандраваньня. Поле нашае і да сяньня знаходзіцца ў немагчымым стане, ў акопах ды дротах. Будынкаў ня маем за што паставіць, а матар'ялу на іх адбудаваньне нам ніхто не даець; адным словам, на кожным кроху адчуваецца ў нас беднасьць і нават голад, бо некаторыя спаміж нас ня маюць куска хлеба.

З вашай дапамогай, паны паслы, стукаемся мы да найвышэйшай улады, каб нас звольнілі ад усіх коштаў камасацыі нашае вёскі ды прынялі-б іх на кошт дзяржавы, бо інакш мы будзем засуджаны на большую яшчэ беднасьць ды бяду, і ня толькі мы, але й нашыя дзеці ніколі ня ўбачаць сьветлых дзён і лепшае долі.

Ад улады тут, у сябе на месцы, мы на нішто добрае ня можам спадзявацца, бо яна ні ў чым ня хоча нам дапамагчы, а толькі бяз літасьці стараецца як найболей з нас сьцягнуць розных падаткаў і на нашай нядолі будуець для сябе шчасьце, дабрабыт, ды апін[illegible] ў вышэйшай улады.

Спадзяемся, што паны паслы дадуць належны ход гэтай нашай жальбе, а вышэйшая ўлада здаволіць нас і вырвець з бяды, у якой апынуліся мы, жыхары вёскі Дубатоўкі".

Дзеля вышэйпісанага ніжэй падпісаныя пытаюцца ў п. Міністра:

1. Ці ведама яму аб тым, што земскі Камісар Рэксьць сьвядома ашукаў жыхараў вёскі Дубатоўкі?

2. Ці маніцца ён зрабіць сьледзтва ў спра[illegible]жанага 29 чэрвеня 1921 г. хітрасьцяй пра[illegible]лу?

3. Ці маніцца з прычыны гэтага звольніць [illegible]хараў вёскі Дубатоўкі ад выплаты 1435,38 [illegible]тых?

Варшава, 20 травеня 1924 г.

ІНТЭРПЭЛЯЦЫЯ

паслоў Беларускага Клюбу да пана Міністра Унутраных спраў—у справе Аляксандра Патапчыка, якому Лідзкае Староства ня выдала дазволу на права мець мысьліўскую стрэльбу дзеля абароны сябе і сваей маемасьці.

Перад вайной жыхары беларускіх абшараў мелі права дзеля абароны сваей маемасьці мець аружжа, выплачываючы за дазвол вельмі малую суму.—Дазвол выдаваўся ня толькі валадарам вялікіх абшараў, але і звычайным вясковым гаспадарам.

Цяпер жа, за час польскае ўлады, беларускі народ пазбаўлены гэнага права. Абшарнікам, шляхце і асаднікам, а так сама польскім вучыцялём на беларускіх абшарах можна мець вагнявое аружжа, як стрэльбы, так і рэвальверы, а беларускаму сялянству не даюць дазволу нават на мысьліўскую стрэльбу.

Ніжэй падаем адзін з фактаў, сцьвярджаючых зьнявагу беларускага народу нявыдачай дазволу на аружжа.

Жыхар засьценку Крышылкі, Ражанскае гміны, Лідзкага павету, Аляксандар Патапчык, падаў у свой час просьбу ў Лідзкае Староства, каб яму далі дазвол на права мець мысьліўскую стрэльбу. Староства яму ў гэтым адмовіла.

А. Патапчык—чалавек, які карыстаецца пашанай, спакойны, ня імсьцівы, дый гады яго ўжо не маладыя; і паколькі жывець ён у засьценку далёка ад людзей, мусіць мець стрэльбу дзеля абароны сваей маемасьці ў начы ад магчымых бо сын забраны ў польскае войска, Патапчык змушаны пасьля штодзеннае працы пільнаваць у начы сваю гаспадарку. Мысьліўскую стрэльбу, якую ён меў, паліцыя адабрала і да гэтай пары не аддае, бо Староства не выдае адпаведнага дазволу.

Дзеля вышэйпісанага інтэрпэлянты пытаюцца ў п. Міністра: 1. Ці маніцца ён загадаць падпарадкаваным яму органам выдаваць беларускаму насяленьню ў патрэбе дазвол на права мець аружжа дзеля абароны сябе і сваей маемасьці? 2. Ці маніцца загадаць паліцыі аддаць Патапчыку стрэльбу?

Варшава, 11 ліпеня 1924 г.

Палітычныя падзеі.

Немцы прынялі плян Доўса.

ПАТ паведамляе, што нямецкі Рэйхстаг, які ў першым і другім галасаваньні ў справе пляну Доўса ня даў вымаганае большасьці ²/₃ галасоў, пры трэцім і акачальным ужо галасаваньні даў зусім новыя вынікі: закон аб утварэньні эмісыйнага банку прыняты 250 галасамі проці 172, аб ліквідацыі Рэнтовага банку — 262 проці 172 і ў справе прамысловых аблігацыяў — 250 проці 175. *Закон жа аб чыгунках прыняты 314 галасамі проці 127, і гэтак урад атрымаў вымаганую канстытуцыяй большасьць* ²/₃. Нацыяналісты галасавалі за гэты закон.

8-гадзінны дзень працы.

Саюзьнікі на Канфэрэнцыі ў Жэневе пастанавілі патрэбаваць ад Нямеччыны точнага выпаўненьня пастановы аб 8-гадзінным дню працы.

„Малдаўская Рэспубліка" ў складзе С.С.Р.Р.

Вялікае абурэньне і трывогу ў Румыніі выклікала вестка аб тым, што бальшавікі з трох паветаў Адэскай губ., дзе пераважае малдаўскае насяленьне (складаючае галоўную масу насяленьня такжа і ў Бэсарабіі), пастанавілі стварыць асобную „Малдаўскую Рэспубліку". Дзеля гэтага ў сьпешным парадку ідзе тамака „малдавізацыя" ўсіх урадовых установаў і школаў. Гэтая Рэспубліка будзе цягнуць да сябе, як да свайго культурна-палітычнага цэнтру, усё насяленьне захопленай гвалтам румынамі Бэсарабіі, служачы для яго „П'емонтам", пакуль справу ня вырашыць аканчальна... гісторыя.

Дзіва, што румынская ўлада, якая на сваіх „усходніх крэсах" чыніць нячуваныя гвалты над паняволеным насяленьнем, спалохалася, а румынская прэса лічыць гэты крок радавага ўраду „правакацыяй"...

Каменеў аб палажэньні ССРР.

На сабраньні прадстаўнікоў камун. партыі Каменеў сказаў вялікую прамову, у якой даў агляд становішча ССРР.

Англа-радавая ўмова паказала, што найвялікшая капіталістычная дзяржава сьвету прызнала правільнасьць дамаганьняў ураду ССРР.

Гарантуючы пазыку, яна прызнала крэдытаздольнасьць ССРР. Варункі пазыкі—ня лёгкія, бо варункі крэдыту наагул цяпер усюдых цяжкія, але карысьці ўмовы і пазыкі—вялізарныя.

Стаўшую на чарзе ўмову з Францыяй—правясьці цяжэй, але ўрад ССРР ня зьбіраецца ані суліць, ані даваць Францыі больш, як Англіі. Наагул, ССРР заканчывае ўладжаньне сваіх міжнародавых адносінаў. Пасьля паразуменьняў з Кітаем і Японіяй ужо ані Польшча, ані Румынія не адважацца выступіць проці ССРР... Галоўная пагроза для ССРР, гэта—стварэньне адзінага гаспадарчага фронту Англіі, Францыі і Амэрыкі з Нямеччынай. Тады фінансы ССРР могуць перацярпець паважную спробу. ССРР пагражае гаспадарчая ізаляцыя, з якой трэба будзе вясьці барацьбу.

Арышт манархістаў.

З Вены паказуюць, што ў Уладывастоку ўлада выкрыла манархічную змову і арыштавала 39 галоўных учасьнікаў. Манархісты быццам меліся паклікаць на трон аднаго з вялікіх князёў.

Высылка 417 сацыялістаў.

З Бэрліна падаюць, што з Масквы высланы ў Вяцкую губ. 417 меншавікоў і эсэраў.

Агітацыя Камінтэрну ў балтыцкіх арміях.

З Рыгі падаюць, што Камінтэрн даў загад сваім агентам узмацаваць камуністычную агітацыю ў арміях балтыцкіх дзяржаў.

Кітайцы скардзяца на Англію Троцкаму.

Кітайскае „Таварыства барацьбы з імпэрыялізмам" падало Троцкаму праз радавага пасла Кара-

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаушы, давай суседу, ці знаемаму, каб і ён пазнау прауду аб жыцьці свайго народу і даведауся, што робіцца на сьвеце!

„Пакаяньне" Савінкова.

Польскія газэты зьмяшчаюць афіцыяльнае паведамленьне радавага ўраду, што 20 жніўня на тэрыторыі ССРР быў арыштаваны Барыс Савінкоў, адзін з найбольш непрымірымых ворагаў радавае ўлады, які яшчэ так нядаўна—пасьля падпісаньня Рыжскае ўмовы—арганізовываў у Польшчы разам з „генаралам" Балаховічам паход на Радавую Беларусь.

Савінкова арыштавалі з фальшывым пашпартам і аддалі пад суд, на якім Савінкоў прызнаўся да ўсіх робленых яму закідаў, **але заявіў, што ўсю сваю дзейнасьць лічыць абмылковай і заклікае ўсіх,** хто любіць сваю Бацькаўшчыну, **прызнаць радавую ўладу і пакарыцца ей.**

Суд засудзіў Савінкова на сьмерць, але падаў ВЦІК'у просьбу аб зьменшаньні кары.

У працягу апошніх гадоў Савінков жыў пераважна ў Польшчы і выдаваў у Варшаве расейскую газэту „За Свободу", якая вяла самую непрымірымую барацьбу з радаваю ўладаю і падтрымлівала палітыку польскага ўраду ў адносінах да нацыянальных меншасьцяў і праваслаўнае царквы. **Савінков карыстаўся поўным даверыем польскага ўраду...**

хана скаргу на гвалты і інтрыгі англійцаў у Кітаю. Таварыства сьпярша зьвярнулася са скаргай на англійскага пасла да Мак-Дональда, але той не зьвярнуў на заяву ніякай увагі. Тады Таварыства пастанавіла зьвярнуцца да Троцкага, каб праз яго зьвярнуць увагу радавага ўраду.

Забойцы Маттэотті прызналіся.

Рымскія газэты падаюць, што забойцы Маттэотті прызналіся ў сваім праступленьні.

Сэрбска-турэцкі канфлікт.

Турэцкія ўлады звольнілі ў Канстантынопалі ўсіх служачых немагамэтан нават у прыватных прадпрыемствах. Югаслаўскі ўрад заявіў проці гэтага пратэст, бо звольненымі пераважна аказаліся сэрбы.

Праект агульнага разбраеньня.

Румынскія газэты падаюць, што румынскі ўрад пастанавіў адкінуць праект разбраеньня, апрацаваны Лігай Народаў, бо ён не гарантуе разбраеньня агульнага. Гэткае-ж становішча заняў і ўрад Югаславіі.

Праект разбраеньня Даніі.

Рада міністраў прыняла апрацаваны ваенным міністрам праект разбраеньня Даніі. Паводле гэтага праекту, месца войска займе паліцэйскі корпус. Марскі ваенны флёт будзе зьліквідаваны зусім, а за тое будзе моцна павялічаны — паветраны.

Пачалося і ў францускім Марокко.

Так нядаўна яшчэ францускія газэты з вялікім здаваленьнем падавалі падробныя весткі аб паўстаньні ў гішпанскім Марокко і — аб паражэньнях тамака гішпанскіх войскаў. А вось тое-ж самае пачалося ўжо і ў суседняй францускай калёніі ў Афрыцы! „Matin" падае, што з гішпанскай граніцы напала на тэрыторыю францускага Марокко каля 600 аружных паўстанцаў. Паўстанцы адбіты...

Тое-ж самае пісалі спачатку і гішпанцы...

ХРОНІКА.

У Радашкоўскай Белар. Гімназіі. Заснаваная ў 1922 годзе Беларуская гімназія ў Радашкавічах пачынае расьці і ўзмацовывацца. Лік вучняў з кожным годам павялічываецца. На сёлетні вучэбны год атрымана канцэсія і на прыгатаваўчую клясу, што дасьць магчымасьць засіляць гімназію адпаведна падгатаванымі вучнямі.

Дзякуючы пэўнаму абнаўленьню вучыцельскіх сіл (запрошаны ў гімназію вучыцялі: Красінсі, Тышкевіч, Якубёнак і інш.) выкладаньне ўва ўсіх клясах і па ўсім прадметам будзе адбывацца ў беларускай мове.

У зьвязку з добрай пастаноўкай навуковай стараны гімназіі паўстае надзея на атрыманьне ў гэтым школьным годзе (1924/25) права выдаваць абсольвэнтам Радашкоўскае гімназіі атэстацыі сьпеласьці.

На работы ў Францыю. Пасрэдніцкія бюро, якія набіраюць работнікаў на палявыя работы і ў капальні ў Францыі, дасталі загад вербаваць такжа беларусаў і украінцаў.

Першая партыя беларусаў ужо набрана ў Горадзеншчыне — ў Гайнаўцы і праз Пазнань выехала ў Францыю.

Дома хлеба зарабіць беларусы ня могуць...

Апублікаваньне законаў аб меншасьцях. У афіцыяльным органе „Dziennik Ustaw." апублікаваны законы аб меншасьцях, якія, як ведама, ўваходзяць у сілу з 1-га кастрычніка.

Да справы стварэньня віцэ-міністра „крэсавых спраў". Газэты падаюць, што, каб прыдаць больш вагі і самастойнасьці віцэ-міністру, ці „падсэкрэтару" для „крэсавых спраў", урад маніцца падчыніць яго не міністру ўнутр. спраў, але — самой Радзе міністраў.

Можа гэтая думка стаіць у сувязі з тым, што кандыдат на гэтае становішча б. Дэлегат ураду п. Роман, у адказ на прапазіцыю гэтага становішча, падаў

ясна апрацавана ўся справа і акрэсьлены яго паўнамоцтвы, бо іначай гэтая рэформа ня будзе мець значных рэзультатаў.

З прычыны гэтай поўадмовы ўсе перамяшчэньні ў усходніх ваяводзтвах стрыманы.

У апошні мамэнт даведываемся, што п. Роман аканчальна адмовіўся ад становішча віцэ-міністра. Гэтак вырашэньне ўсяе справы з устанаўленьнем гэтага становішча прыпынілася.

З другога боку ёсьць весткі, быццам сярод некаторых кругоў грамадзянства выстаўляецца кандыдатура на гэтае становішча п. Рамана Скірмунта, абшарніка-беларуса.

Да абароны граніцаў. Паводле праекту ўраду, для абароны граніцаў на ўсходзе будзе створаны спэцыяльны „корпус пагранічнай старожы“. Кантроль над граніцамі будзе павялічаны. Закрыты будуць усе „рухомыя“ тарговыя пункты, а пакінуты будуць толькі сталыя, якія лягчэй кантраляваць.

Новы павет — Шчучынскі. Дэлегатура згадзілася на выдзяленьне з Лідчыны часткі тэрыторыі і стварэньне з яе асобнага новага павету — Шчучынскага.

У гэтай „рэформе“ трэба шукаць так званай „выбарнай геаграфіі“, ці чагось у гэтым родзе.

Старадаўныя магілы. „Усх. Аг.“ паведамляе, што ў Бярэсьці, пры работах па правядзеньні трамваю, наткнуліся на тры вельмі старыя, мо' — дагістарычныя магілы — з рознымі прадметамі з бронзы.

Выясьненьне.

У адказ на лісты, з каторымі да мяне зварачаюцца нашы выбаршчыкі ў справе 4-х маіх рэзалюцый у зямельных справах, прынятых Сэнатам Польскай Рэспублікі (глядзі № 25 „Сына Беларуса“ г.г.), мушу вытлумачыць, што рэзалюцыі законадаўчых Палат павінны быць прыняты урадам абавязкова пры пісаньні новых законаў, і ўрад павінен імі кіравацца, як тэндэнцыяй, пры тлумачэньні ўставаў.

Сэнатар **А. Уласаў.**

Весткі з вёскі.

З Наваградчыны.

У ліпні прыяждала ў Наваградак украінская трупа, якая іграла ў працягу больш тыдня і спачатку мела ўдачу дзякуючы таму, што сярод урадоўцаў ёсьць шмат галічан. Чаму-б беларускай трупе не праехацца па беларускіх мястох?

Пры ўезьдзе ў Наваградак ад вузкай калейкі стаіць пры вастрозе памятнік А. Міцкевічу, фігура ў рост чалавека. Як ведама, калісь Міцкевіч сядзеў у расейскім вастрозе. Дзеля гэтага мяйсцовае польскае грамадзянства, відаць, і рашыла, што найлепшае мейсца для такога вялікага песьняра—пры вастрозе, бо ў самым вастрозе яго ніхто ня ўбачыў-бы...

Наваградзкая дзяржаўная гімназія з гэтага году пазбылася дырэктара Глэмбоцкага, які кіраваў ёю ў працягу 3 гадоў. Беластоцкі Куратар падзякаваў яму, напісаўшы да яго, што „Кураторыум ня мае замеру карыстаць з яго працы ў наступным годзе“. Бедны дырэктар не атрымаў нават мейсца настаўніка ў сваім куратарстве. Цікава, ці мяйсцовае грамадзянства паднясло яму адрас з падзякаю за яго працу, як яно гэта зрабіла тады, калі адзін хуліган даў яму аплявуху, і дырэктар хацеў кінуць тады дырэктарства. Закід, зроблены п. Глэмбоцкаму, быццам такі, што „niedostatecznie włada językiem polskim“.

Доля п. Глэмбоцкага прыпамінае мне долю другога дырэктара і ў другім куратарстве. Палкоўнік Віт выкладаў у гімназіі Шуліцкай у Баранавічах, Палескага Вокругу. Яго зрабілі дырэктарам дзяржаўнай гімназіі ў Баранавічах. Каб лепш умацавацца, ён нават прыняў каталіцтва. Але згубіў яго негаваротлівы язык; не памагла і перамена веры. Яму адмовілі і ў дырэктарстве, і ў настаўніцтве пасьля аднаго году.

Вялікаю плягаю ў нас зьяўляюцца ваўкі. Кожны гаспадар, які мае авечак, плаціць ім падаткі і надта вялікія. Бо калі гаспадар мае найвышэй 4—5 авечак, а ваўкі ў яго за лета возьмуць 2 авечкі, то гэта страта вельмі велькая, хоць адказвайся трымаць авец. З другога боку, матэрыя сукенная такая дарагая, раўнуючы з цаною збожа, што, калі селянін сам сабе ня зробіць сукна, дык будзе хадзіць голы. Фабрыкі працуюць не для яго.

Сьвяты ў нас сьвяткуюць па старому стылю: народ баіцца навіны, бо ведае, з якою мэтаю ўсё гэта робіцца. Ужо тое, што закон выйшаў ад нейкага турэцкага патрыярха, вельмі непадабаецца народу.

І вось, па новаму стылю йдзе адправа ў царкве, але нікога ў ёй няма: народ працуе. Па старому стылю народ сьвяткуе, але таксама ня ходзіць у царкву, ці там служыцца, ці не. Гэтым законам, як і адбіраньнем цэркваў, урад Рэчыпаспалітай у адносінах да праваслаўных робіць тое самае, што ў Расеі робяць камуністы: ён вырывае з душы народу рэлігію. **Б.**

З многапакутнае Косаўшчыны.

(Вёска **Яглевічы**, Косаўскага павету).

Уклонна прашу зьмясьціць у паважанай газэце „Сын Беларуса“ жыцьцё нашае ваколіцы. Адначасна напомніце нашым паслом праз газэту, каб яны скарэй прыехалі да нас у Косаўшчыну, бо яны абяцалі быць да 10 г. м., і сяляне цяпер чакаюць, ды ніяк не дачакаюцца, каб паскардзіцца сваім паслом.

Якраз цяпер нашы паны сьвяткуюць угодкі вядомага катаваньня ў Косаўшчыне ў 1923 годзе. — Некатарых з арыштаваных тады сялян звальняюць з турмы. Вінярскі і Абрамчык з м. Тэлеханы, якія прасядзелі па $11^1/_2$ месяцаў у Слоніме, 10 г. м. зволынены, і справа іх зьліквідавана. Значыць, яны нявіна пацярпелі, а яшчэ засталася з тэлеханскага нападу нявінных у турме слонімскай М. Лушчык і М. Савіч; варта было-б зьвярнуць увагу нашым паслом на гэтыя бязьвінныя ахвяры.

Таксама яшчэ дагэтуль цягнецца справа Я. Бахура і А. Клюткі, які па звальненьні з турмы аж 10 месяцаў ходзіць кожную пятніцу на „мэльдунак“. Той-жа Клютко ў пачатку жніўня быў затрыманы на ст. Івацэвічах, ідучы з пошты з газэтай „Сын Беларуса“, якую забараняе чытаць паліцыянт Вацоўскага пастарунку, Падгурскі, які і адабраў у Клюткі сілай 10 №№ „С. Б.“, прысыланыя для Сэкратарыяту Пасольскага Клюбу ў Яглевічах. Пасьля на пошце не давалі некалькі №№ „С. Б.“, бо паліцыя забараніла выдаваць, але цяпер зноў аддаюць.

Дык, значыцца, у сувязі з угодкамі і галоўным чынам таму, што ў дзясатыя ўгодкі „Вялікай Вайны“ было раскідана шмат камуністычнай літаратуры з пратэстам проці вайны, — пачалося лютае цкаваньне на сялянскую моладзь і наагул на ўсіх тых, хто чытае „Сына Беларуса“. Так 10 жніўня ў вёсцы Козіках і Вольцы, Борка-Гічыцкай гміны, па даказу паўпанкаў быў зроблены вобыск, дзе, як водзіцца, нічога не знайшлі, толькі ў селяніна з Козік М. Муца знайшлі „Прамовы паслоў Беларускіх“, „Які самаўрад гатуе Польшча“ Сулімы, „Трактат“ і некалькі №№ „С. Б.“. Прывёўшы его, Муца, да Івацэвіч, скавалі па рукам і нагам і пачалі біць, крычучы, што ён камуніст. Да гэтых кніжачак яшчэ неяк далучылася адозва камуністычная, якой у Муца пры вобыску ня было; на гэта ёсьць сьведкі...

Цяпер Муца звольнілі, пратрымаўшы 3 дні, з падпіскай бяз ведама паліцыі нікуды не выяжджаць.

З тых-жа Козік сідзяць у Слоніме бацька і два сыны, якіх, як кажуць, таксама білі, ды, забраўшы іх, зьнішчылі ўсю гаспадарку.

Скардзяцца сяляне з вёскі Яглевіч і на падаткі, якімі абкладае Гмінная Рада і Ўрад, прычым склад Гміннае Рады выключна з паноў, якія „выбраны“ ў 1919 годзе, калі сялян ня было ў дому, і цяпер сяляне просяць парадзіць, як перавыбраць Гмінную Раду.

Таксама бядуюць яшчэ аб тым, што паліцыя забараніла вадзіць коні на папас у начы. У начы з 11 на 12 жніўня за вёскай на полі акружыла паліцыя начлежнікаў, зьбіла сялян К. Пытляка, Д. Прымака і П. Осініка, прычым разьдзявалі ў начы да-гала, шукаючы чаго-та і крычучы, што сяляне — камуністы і бандыты. Куды цяпер скардзіцца? што рабіць?

Вось і рашылі сяляне прасіць праз газэту паслоў, каб яны іх паратавалі.

І яшчэ адна прaява — гэта школа. У нашым павеце няма ніводнае беларускае школы. Хоць настаўнікаў ёсьць шмат, але бяда, што не згуртаваны. У нашай вёсцы Яглевічах аж 105 дзяцей, якія гадуюцца без усялякае навукі.

Просім парадзіць праз газэтку на нашы пытаньні:

1) як выбраць Гмінную Раду;

2) як адчыніць школу — і куды зьвяртацца за дапамогай, за вучэбнікамі і за інш. рэчамі для вучняў.

Кучучок.

Ад Рэдакцыі. У справе перавыбару гміннае рады нічога зрабіць нельга: ў тымчасовых правілах гэта не прадугледжана, а новага закону Сойм яшчэ й не пачаў разглядаць.

У школьнай справе ў нумары 33 „С. Б.“ надрукавана падробная інструкцыя, а наагул у справе школ трэба зварачацца да Беларускае Цэнтральнае Школьнае Рады ў Вільні, **Віленская вул. № 12, кватэра 6.**

Вёска Путнікі, Радашкоўскае вол.

Недалёка ад граніцы, па дарозе з Алёхнавіч у м. Радашковічы, ляжыць наша вёска. Хто толькі праяжджаў праз яе, той зьвярнуў увагу на доўгі шнур будынкаў абапал дарогі. Побач з вельмі старэнькімі хаткамі, якія ўжо апускаюцца ў зямлю, часам спатыкаем новыя дамы. Вайна, пажары і другія няшчасьці не абмінулі в. Путнікі. Кажуць, што пасьля няўдач павінна прыходзіць лепшае жыцьцё. Аднак, ніяк ня можам дачакацца гэтага лепшага жыцьця. Усе жывем вельмі бедна, нехапае зямлі, заработкаў ніякіх, а тут яшчэ гэтыя падаткі — то „панствовыя“, то сойміковыя, то валасныя, — проста, няма адчэпу.

Ня гледзячы на тое, што так гаруем на ўсе павіннасьці, дзеткі нашы астаюцца амаль саўсім бяз школы. Школьная ўлада ня толькі ня думаець адкрыць у нас публічную школу ў роднай мове, але яшчэ робіць усялякія перашкоды існуючай прыватнай беларускай школе.

У гэтым годзе, як і ў папярэдніх гадох, Таварыства Беларускае Школы ў Радашкавічах, дбаючы аб роднай асьвеце, падало заяву да Школьнага Інспэктара аб фармальным залегалізаваньні беларускай школы ў нашай вёсцы.

Тутэйшы.

З УСХОДНЯЕ БЕЛАРУСІ.

Дзейнасьць Цэнтраземскладу.

У зьвязку з ажыўленьнем гандлю, Цэнтраземсклад у апошні мамэнт вылучыў з сваіх сродкаў неабходную суму грошай дзеля аднаўленьня нармальнай дзейнасьці Віцебскага машыннага заводу.

Апроч таго ўдалося закупіць значныя партыі сел.-гасп. машын заграніцаю на вельмі выгадных варунках і падняць вытворчасьць майстэрняў імя Бурбіса ў сярэднім да 500 плугоў і 25 веялак у месяц.

У зьвязку з пашырэньнем Беларусі, да Цэнтраземскладу адыйшоў цэлы рад аддзяленьняў Дзяржаўнага сельска-гасп. складу СРФСР—Віцебскае, Рагачоўскае, Полацкае, Аршанскае, Мсьціслаўскае і Чэрыкаўскае.

Усе гэтыя аддзяленьні, акрамя Віцебскага, у мамэнт перадачы мелі невялікую колькасьць тавараў і далёка ня першай ходкасьці (Аршанскае аддз. на 3634 р., Рагачоўскае—1070 р., Полацкае—8555 р., Мсьціслаўскае—7976 р. і Чэрыкаўскае — 10.050 р.).

Цяпер за рахунак запасаў Цэнтраземскладу ўсе адзначаныя аддзяленьні належна забясьпечаны насеньнем.

За мінулы час Цэнтраземсклад прадаў розным сялянскім установам гэткія рэчы:

Плугоў розных—2990, баронаў—663, акучнікаў—58, сеялак—23, жняярак—5, сенакасілак—105, малатарняў—104, веялак—103, сячкарняў—513 і сэпаратараў—95.

У вясеньнюю пасяўную кампанію г. г. Цэнтраземсклад, ня гледзячы на мізэрнасьць грашовых рэсурсаў, усе свае заданьні выпаўніў здавальняюча.

Да беларускага вучыцельства, скончыўшага ў 1921/22 г. вучыцельскія курсы ў Кракаве.

ГРАМАДЗЯНЕ!

У 1921 г. польская ўлада адарвала Вас ад свайго роднага Беларускага Народу і выслала на вучыцельскія курсы ў Кракаў. Па сканчэньні гэтых курсаў тая-ж улада паназначала Вас на вучыцялёў у польскія школы—часта нат' ня ў роднай краіне.

Даволі зьдзеку!

Пара Вам вярнуцца да свайго Беларускага Народу і сярод яго шырыць прасьвету.

Беларуская Цэнтральная Школьная Рада ў Вільні, прыступаючы да арганізаваньня беларускіх пачатковых школ на 1924/25 школьны год, гэтым зварочваецца да Вашага беларускага пачуцьця з просьбай найхутчэй адказаць ей на гэтыя пытаньні:

1. дзе Вы цяпер прабываеце? (Ваш акуратны адрэс),

2. ці згодны Вы, замест у польскай, працаваць у беларускай школе?

Грамадзяне, адклікайцеся!!!

Беларус. Цантр. Школ. Рада ў Вільні.
(Віленская вул. № 12. п. 6.).

Наша пошта.

1) **Яну Грэцкаму.** 2 зл. атрымалі; 2) **Б. Пінеўскаму.** 2 зл. атрымалі; 3) **Яну Марчуку.** 8 зл. атрымалі. Просьбу спаўняем; 4) **Ігнату Дземеніку.** 4 зл. атрымалі; 5) **Якубу Шкляруку.** 2 зл. атрымалі; 6) **Ал. Угліку.** 5 зл. атрымалі; 7) **Яну Боўсюку.** 4 зл. атрымалі, газэту высылаем; 8) **Сьцяпану Юдыцкаму.** 2 зл. атрымалі. Газэту высылаем; 9) **Базылю Садчынскаму.** 2 зл. атрымалі. Газэту высылаем; 10) **Кучучку.** Атрымалі. Пішэце ўсё. Вельмі дзякуем. Друкуем. **Аляксею Іванову.** Паводлуг рахункаў за Вамі даўгу ўжо няма: заплочана ўсё па 1-е верасьня. Цяпер чакаем падпіскі за месяц верасень.